Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце БДУКМ
____________ В.Р. Языковіч
"24" чэрвеня 2019 г.
Рэгістрацыйны № ВД-137/эвуч.

# САЦЫЯДЫНАМІКА СУЧАСНАГА КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНАГА ПРАЦЭСУ

*Вучэбная праграма*
*установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці II ступені вышэйшай адукацыі*
*1-21 80 13 Культуралогія*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2019

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі ОСВО 1-21 80 13-2019 Культуралогія і вучэбнага плана па спецыяльнасці 1-21 80 13 Культуралогія, рэг. № Д 21-2-006/пр.-тып. ад 21.03.2019 г.

**СКЛАДАЛЬНІК**

*Ю. І. Кнацько,* дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*У.А. Жылко*, дацэнт кафедры турызму і культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы», кандыдат культуралогіі;

*Ю.А. Косік,* старшы выкладчык кафедры міжкультурных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 12 ад 29.05.2019)

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 12.06.2019)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за выпуск: *Ю.І. Кнацько*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Актуальнасць вывучэння сацыядынамікі сучаснай культуры як адной з асноўных вучэбных дысцыплін у сістэме вышэйшай культуралагічнай адукацыі абумоўлена навуковай неабходнасцю даследавання шматаспектнага працэсу генезіса сусветнай культуры. Веданне базавых канцэптаў, мадэляў, фактараў і механізмаў сацыядынамікі культуры фарміруе у спецыяліста-культуролага сістэмнае гледжанне на культурагенетычны працэс, дае падставы для прагназавання вектараў будучага сацыякультурнага развіцця, што у сваю чаргу спрыяе павышэнню якасці прафесійнага майстэрства і пашырэнню магчымасцяў навукова-даследчай дзейнасці.

Праграма, распрацаваная ў межах адукацыйнага стандарту, прадугледжвае комплекснае вывучэнне сацыядынамікі сучаснай культуры для удасканалення у магістрантаў ведаў аб асноўных працэсах і заканамернасцях сучаснага сацыякультурнага развіцця.

*Мэтай* вучэбнай дысцыпліны "Сацыядынаміка сучаснага культурна-гістарычнача працэсу" з'яўляецца фарміраванне ў магістрантаў навуковага базісу ведаў аб культуры як зменным працэсе, які мае спецыфічныя формы, механізмы, фактары, тэмпаральныя і выніковыя характарыстыкі, а таксама веды аб актуальным стане і перспектывах развіцця айчыннай і сусветнай культуры.

*Задачы*:

– раскрыць сутнасць культуры як шматкампанентнай зменлівай сістэмы;

– эксплiцыраваць навуковыя даследаванні і канцэптуальныя падыходы, якія адлюстроўваюць асноўныя заканамернасці і складнікі працэсу сацыядынамікі сучаснай культуры;

– сфарміраваць навыкі навуковага абгрунтавання мадэляў, тэмпаральных характарыстык, механізмаў пераўтварэння сучаснай культуры;

– устанавіць прычынна-выснoўныя сувязі паміж дэтэрмінатамі культурных змен і вынікамі сацыядынамічнага працэсу;

– ахарактарызаваць тэндэнцыі развіцця сучаснай сусветнай культуры, вызначыць асаблівасцей сацыядынамікі айчыннай сацыякультурнай прасторы.

Вучэбная дысцыпліна "Сацыядынаміка сучаснага культурна-гістарычнача працэсу" мае міжпрадметныя сувязі з такімі вучэбнымі дысцыплінамі як: "Культуралогія", "Гісторыя Беларусі", "Культурна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гістарычныя тыпы цывілізацый: фальклор і сучаснасць”, “Дынаміка сусветнай культуры”і некаторымі іншымі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны магістрант павінен *ведаць:*

– базавыя паняцці і праблематыку дысцыпліны;

– асноўныя сацыядынамічныя характарыстыкі культуры;

– канцэптуальныя падыходы да праблемы даследавання сацыядынамікі сучаснай культуры;

– тэмпаральныя характарыстыкі сацыядынамкі сучаснага культурна-гістарычнага працэсу;

– актуальныя мадэлі і механізмы сацыякультурнай дынамікі;

– фактары, спрыяючыя культурна-гістарычным зменам і вынікі іх уплыву на сучасную культуру;

– становішча і перспектывы развіцця сусветнай і айчыннай культуры.

*умець:*

– характарызаваць складнікі асноўных пераўтваральных працэсаў у культуры;

– сістэматызаваць і ўжываць у практычнай дзейнасці тэарэтыка-метадалагічны матэрыял, які адлюстроўвае сутнасць сучаснага сацыядынамічнага працэсу;

– абгрунтоўваць уплыў знешніх і ўнутраных дэтэрмінант на вынікі і асаблівасці развіцця сучаснай культуры;

– аналізаваць спецыфіку сучаснага трансфармацыйнага працэсу цалкам і вызначаць адметныя рысы развіцця асобных галін культуратворчасці ў кантэксце нацыянальных культур.

*валодаць:*

– канцэптуальнай і метадалагічнай базай ў межах праблемнага поля дысцыпліны;

– сучаснымі прыёмамі комплекснага аналізу сацыядынамікі культуры;

– метадамі навукова-педагагічнага даследавання для далейшай рэалізацыі і эфектыўнага функцыянавання практыка-арыянтаванай мадэлі навучання.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Сацыядынаміка сучаснага культурна-гістарычнача працэсу” павінна забяспечыць фарміраванне ў магістрантаў наступных паглыбленых прафесийных і спецыяльных кампетэнцый:

ППК-2. Быць здольным да ўдзелу ў разнастайных формах культурна-асветніцкай дзейнасці;

СК-1. Быць здольным праводзіць даследаванні ў кантэксце сучасных культуралагічных тэарэтыка-метадалагічных канцэпцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры вывучэнні дысцыпліны мэтазгодна выкарыстоўваць *метады навучання:* тлумачальна-ілюстратыўны, эўрыстычны, кейс-метад (метад сітуацыйнага аналізу), метад уключанага назірання, вучэбнае мадэляванне практыка-арыентаванага навуковага даследавання.

У межах фарміравання сучасных сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый магістрантаў пры правядзенні семінарскіх заняткаў выкарыстоўваюцца методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы.

Вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Сацыядынаміка сучаснага культурна-гістарычнага працэсу” усяго для дзённай формы навучання прадугледжана 108 гадзін, з якіх 52 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 28 гадзін – лекцыі, 16 гадзін – практычныя, 8 гадзін – семінарыю

Для завочнай формы навучання прадугледжана 14 гадзін. Прыкладнае размеркаванне гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 8, семінары – 6.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### *Тэма 1. Уводзіны. Мэта, задачы, аб’ект і прадмет курса “Сацыядынаміка сучаснага культурна-гістарычнача працэсу”*

Змест і праблемнае поле дысцыпліны “Сацыядынаміка сучаснаага культурна-гістарычнача працэсу”. Аб’ект, прадмет, мэта і задачы, структура вучэбнай дысцыпліны. Месца дысцыпліны ў сістэме культуралагічных ведаў, міжпрадметныя сувязі. Метадалагічныя падставы даследавання сацыядынамікі культуры.

Культуралагічные абгрунтаванне паняняццяў “культурна-гістарычны працэс”, “сучаснасць” і “сучасная культура”.

### *Тэма 2. Культура як працэс. Устойлівае і зменнае у культуры. Змест і суадносіны паняццяў “культурныя змены”, “дынаміка культуры”, “сацыядынаміка культуры”*

Культурны працэс як змена культурных сістэм і аб’ектаў: генезіс, фарміраванне, функцыянаванне, распаўсюджванне, зменлівасць, ўзнаўленне культуры. Тыпы культурагенетычных працэсаў. Роля культурных з’яў у развіцці культуры.

Культурныя змены як пераўтваральны працэс, пазбаўлены цэласнасці, дакладна не вызначаны ў прасторы і часе. Прычыны інэрцыянальнасці і іннавацыйнасці культуры.

Дэтэрмініраванасць, цэласнасць, паслядоўнасць працэса дынамікі культуры. Прагрэсіўная і рэгрэсіўная скіраванасць дынамікі культуры.

Сацыядынаміка культуры аб заканамернасцях працэсаў, тэндэнцый, аб ўзаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці змен у культуры і грамадстве.

### *Тэма 3. Сацыядынамічная парадыгма: канцэптуальная абгрунтаванне паняцця і працэса сацыядынамікі культуры*

Пачатак асэнсавання прыроды культурных змен ў працах антычных філосафаў (Арыстоцель, Геракліт, Гесіёд, Платон).

Погляды мысліцеляў эпохі Адраджэння на чалавека як уладальніка вышэйшага разуму і патэнцыялу да переаўтваральнай дзейнасці ( Т. Мор, Э. Ратэрдамскі і інш.)

Аналіз крыніц і механізмаў культурных зрухаў у працах вучоных Новага часу (Г.Гердэр, Т.Гобс, І. Кант, Ж. Русо, І. Фіхтэ, Ф. Шэлінг і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дыялектыка колькасных і якасных характарыстык, класіфікацыя культурных змен у канцэпцыі Г. Гегеля.

Абгрунтаванне стадыяльна-паступальнага характару сацыядынамікі культуры (А. Басціан, Т.Вайц, Э. Дзюркгейм, Г. Зімель, Ш. Летурна, Л. Морган, Г. Спэнсэр, Э. Тайлар, Дж. Фрэзер і інш.). Ідэя цыклічнасці ў культурным развіцці (Н. Данілеўскі, А.Тойнбі, О. Шпэнглер). Сацыядынаміка культуры як натуральна-гістарычны працэсу і змена грамадска-эканамічных фармацый (К. Маркс).

Вывучэнне сацыядынамікі культуры навукоўцамі ХХ ст. Біхевіярызм аб культурных зменах у кантэксце адхілення ад норм устойлівасці асобных частак культуры і яе адаптацыі к новым умовам функцыянавання (Б. Скінэр, Э. Тарндайк, Б. Уотсан, К. Холл). Сінергетычны падыход аб няўстойлівым, нераўнаважлівым становішчы культуры (С. Курдзюмаў, Н. Маісееў, І. Прігожын, В. Сцепін, Г. Хакен і інш.). Прадстаўнікі экзістэнцыяналізму аб суб’ектыўным пачатку сацыядынамікі культуры (Г. Марсэль, Ж.-П. Сартр, М. Хайдэгер і інш.). Культурная разнастайнасць і пераўтваральны патэнцыял дыялогу культур у працах М. Бахціна, В. Біблера, М. Бубера.

Аксіялагічныя складнікі сацыядынамікі культуры ў працы П. Сарокіна “Сацыяльная і культурная дынаміка”. Суб’ект культуры як рухаючы фактар пераўтварэнняў.

Праца А. Моля “Сацыядынаміка культуры”. Уплыў тэхнічнага прагрэсу і масавай камунікацыі на фарміраванне “сацыякультурнай табліцы”. Чатыры асноўныя пераўтваральныя дактрыны: дэмагагічная, дагматычная, эклектычная або інфармацыйная, сацыядынамічная. Паняцці “культурэмы”, “каэфіцыент культурнай разнастайнасці”, “мазаічная культура”.

Постмадэрністычная трактоўка сацыядынамікі культуры ў якасці эмерджэнтнага, цесна звязанага с сацыяльным узаемадзеяннем, ірацыянальнага і не маючага дакладнай скіраванасці працэсу (Р. Барт, Ж. Бадрыйяр, Ф. Гватары, Ж.-Ф. Ліатар і інш.).

Анцітэза “выбухных” і паслядоўных працэсаў у сацыядынаміцы культуры, роля механізму стабілізацыі ў працы Ю. Лотмана “Культура і выбух”.

Вызначэнне вучонымі-тэхніцыстамі месца інфармацыйных працэсаў і камунікацыі ў сацыядынаміцы сучаснай культуры (Д. Бэлл, У. Дайзард, М. Кастэльс, Д. Ленскі, М. Маклюэн, І. Масуда, І. Негадаеў, Т. Стоўнер, Э. Тофлер, А. Этцыоні і інш.). Роля тэхнасферы, сацыясферы, інфасферы і псіхасферы ў сацыякультурным развіцці (Э. Тофлер).

Кагнітыўная культуралогія аб неабходнасці кагнітыўнага аналізу і мадэлявання працэсу сучаснай сацыядынамікі культуры (У. Гудэнаф, Т. Карнажыцкая, Ч. Луміс, М. Мінскі і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 4. Тэмпаральныя характарыстыкі працэсу сацыядынамікі культуры*

Прастора-часавыя складнікі сацыякультурных змен. Макрамаштабныя змены або гістарычная дынаміка, генезіс культуры. Сярэднемаштабныя змены ў кантэксце эканамічнага ўздыму і спаду, жыццядзейнасці і змены пакаленняў. Мікрасаштабныя змены ў межах канкрэтнага культурнага кантэксту, асаблівасці функцыянавання груп і асобных індывідаў. Рытм і тэмп культурных пераўтварэнняў.

### *Тэма 5. Мадэлі сацыядынамікі культуры*

Лінеарная мадэль сацыядынамікі культуры, крытэрыі прагэсу ў сусветнай гісторыі (Г. Гегель, І. Гердэр, А. Кандарсье, І. Кант, К. Клакхан, Э. Тайлар, Л. Уайт і інш.). Інтэрпрытацыі лінеарнай мадэлі - рыверсіўная мадэль (Ж. Русо) і дывеантная мадэль (А. Кробер, Д. Сцюарт, Л. Уайт, М. Харыс). Цыклічная мадэль сацыядынамікі культуры: паўтаральнасць і паслядоўнасць пры змене фаз і станаў культуры. Варыянты цыклічнай мадэлі: інверсія (Ю. Лотман, Ю. Якавец), лакальныя цывілізацыі (Н. Данілеўскі, А. Тойнбі, О. Шпэнглер). Валнавая мадэль сацыядынамікі культуры як сінтэз лінеарнай і цыклічнай мадэляў (Н. Кандрацьеў, Э. Тофлер, Й. Шумперт і інш.). Сінергетычная і постмадэрністычнаая мадэлі сацыядынамікі сучаснай культуры.

### *Тэма 6. Механізмы сацыядынамікі культуры*

Зварот да культурнай спадчыны і традыцыя як механізм узнаўлення культуры і сацыякультурных інстытутаў. Напружаны характар развіцця сучаснай культуры ў межах двух супрацьлеглых тэндэнцый - кананізацыі культурных дасягненняў або адмова ад іх.

Роля вынаходак і навацый у культуры. Творчая асоба як носьбіт навацый у культуры.

Дыфузія культуры, прасторава-геаграфічнаераспаўсюджванне элементаў культуры. Гарызантальная дыфузія культуры паміж некалькімі этнасамі, сацыякультурнымі групамі, асобнымі індыідамі і вертыкальная дыфузія паміж культурамі з рознымі статусамі. Фактары культурных запазычванняў. Культурны сінтэз і сімбіёз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 7. Паліфактарнасць сучаснай сацыядынамікі культуры*

Змест паняцця "фактар". Класіфікацыя фактараў сацыядынамікі культуры (асноўныя і другарадныя, знешнія і ўнутраныя, аб'ектыўныя і суб'ектыўныя, агульныя і спецыфічныя, пастаянныя і часовыя, інтэнсіўныя і экстэнсіўныя і інш.). Узаемасувязь колькасных і якасных фактараў.

Уплыў прыродна-рэсурснага і экалагічнага фактараў на развіцце культуры. Роля фактараў прасторавага размяшчэння культурных формаў, структурных сувязей, сацыяльных інстытутаў і адносін. Значэнне фактараў індывідуальнай актыўнасці, рацыянальных змен і кіравання. Актуальнасць фактараў інфарматызацыі культуры, масавізацыі культуры, міжкультурнай камунікацыі і дыялогу культур, глабалізацыі, культурнай палітыкі.

### *Тэма 8. Вынікі сацыякультурнай дынамікі*

Крытэрыі і падыходы да ацэнкі вынікаў сацыякультурных змен у асобных галінах культуратворчасці. Аб'ектыўнасць ацэнкі актуальнага развіцця навукі, адукацыі, эканомікі, сродкаў масавай камунікацыі і суб'ектыўныя высновы або немагчымасць ацэнкі развіцця мастацтва, стыляў, мастацкіх напрамкаў, рэлігіі, моды і інш.

Канструктыўныя вынікі сацыякультурнай дынамікі: працэсы ўзыходжання, ўзбагачэнне, дыферэнцыяцыя культуры. Дэструктыўныя вынікі: крызісныя працэсы ў культуры, спрашчэнне, заняпад, дэградацыя культуры і інш.

### *Тэма 9. Асаблівасці сацыядынамікі беларускай сучаснай культуры (канец XX- пачатак XXI ст.)*

Навуковае даследаванне спецыфікі сацыядынамікі сучаснай беларускай культуры ў працах айчынных даследчыкаў Я. Бабосава, А. Данілава, П. Ігнатовіча, Ч. Кірвеля, Д. Крывашэя, А. Марозава, В. Пазнякова, А. Салікава, А. Смоліка, Д. Смоліка, В. Шадурскага, І. Шыршова, В. Языковіча і інш.

Уплыў геапалітычнага, гістарычнага, сацыякультурнага фактараў на фарміраванне тыпалагічных рысаў (адкрытасць, дыялагізм, талерантнасць, поліэтнічнасць, поліканфесіянальгасць і інш.) беларускай культуры, абумовіўшых асаблівасці яе сучаснай сацыядынамікі.

Сучасная беларуская культура ва ўмовах культурнага палімарфізму. Сітуацыя транзітыўнасці, дыхатамія глабалізм-лакалізм і пошук уласнай мадэлі культурнага развіцця. Рэфарміраванне як асноўны механізм дасягнення новай сацыякультурнай рэальнасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Роля культурнай палітыкі ў захаванні і развіцці айчыннай культуры. Дакументальная фіксацыя вектараў сацыякультурнага развіцця (закон “Аб культуры Рэспублікі Беларусь”, Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры, Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь і інш.). Актуальныя накірункі сучаснай беларускай унутранай і знешняй культурнай палітыкі. Эканамічныя падмуркі функцыянавання культуры. Эксплікацыя прамежкавых вынікаў сацыядынамікі культуры ў сучасным беларускім мастацтве, літаратуры, музейнай і бібліятэчнай галінах, адукацыі і навуцы. Мадэляванне будучыні і перспектывы развіцця беларускай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА**
**ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ**
**(дзённае навучанне)**

| Нумар раздзела, тэмы | Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | |
| 1 | Уводзіны. Мэта, задачы, аб’ект і прадмет курса “Сацыядынаміка сучаснаага культурна-гістарычнача працэсу” | 2 | | | |
| 2 | Культура як працэс. Устойлівае і зменнае у культуры. Змест і суадносіны паняццяў “культурныя змены”, “дынаміка культуры”, “сацыядынаміка культуры” | 2 | 2 | 4 | дыскусія |
| 3 | Сацыядынамічная парадыгма: канцэптуальная абгрунтаванне паняцця і працэса сацыядынамікі культуры | 4 | 2 | 4 | рэферат |
| 4 | Тэмпаральныя характарыстыкі працэсу сацыядынамікі культуры | 1 | 1 | | |
| 5 | Мадэлі сацыядынамікі культуры | 2 | 2 | 2 | апытанне |
| 6 | Механізмы сацыядынамікі культуры | 1 | 1 | 2 | апытанне |
| 7 | Паліфактарнасць сучаснай сацыядынамікі культуры | 2 | 2 | 4 | прэзентацыя |
| 8 | Вынікі сацыякультурнай дынамікі | 2 | 2 | 2 | апытанне |
| 9 | Асаблівасці сацыядынамікі беларускай сучаснай культуры (канец XX-пачатак XXI ст.) | 2 | 2 | 2 | апытанне |
| | **Разам…** | **18** | **14** | **20** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА**
**ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ**
**(завочнае навучанне)**

| Нумар раздзела, тэмы | Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі |
| 1 | **1.** Уводзіны. Мэта, задачы, аб’ект і прадмет курса “Сацыядынаміка сучаснаага культурна-гістарычнача працэсу” | 2 | |
| 2 | **2.** Культура як працэс. Устойлівае і зменнае у культуры. Змест і суадносіны паняццяў “культурныя змены”, “дынаміка культуры”, “сацыядынаміка культуры” | 2 | 1 |
| 3 | **3.** Сацыядынамічная парадыгма: канцэптуальная абгрунтаванне паняцця і працэса сацыядынамікі культуры | 2 | 2 |
| 7 | **7.** Паліфактарнасць сучаснай сацыядынамікі культуры | | 1 |
| 9 | **9.** Асаблівасці сацыядынамікі беларускай сучаснай культуры (канец XX-пачатак XXI ст.) | 2 | 2 |
| | **Разам…** | **8** | **6** |

**Тэмы для самастойнай работы студэнтаў:**

**4.** Тэмпаральныя характарыстыкі працэсу сацыядынамікі культуры
**5.** Мадэлі сацыядынамікі культуры
**6.** Механізмы сацыядынамікі культуры
**8.** Вынікі сацыякультурнай дынамікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*


1. *Данилевский, Н. Я.* Россия и Европа. Взгляд на культурные и политические отношения славянского мира к германо-романскому / Н. Я. Данилевский. – СПб. : Изд-во С.-Петерб. ун-та : Изд-во «Глаголь», 1995. – 396 с.

2. *Данилов, А. Н.* Переходное общество: проблемы системной трансформации / А. Н. Данилов. – Минск : Харвест, 1998. – 429 с.

3. *Кармин, А. С.* Динамика культуры / А. С. Кармин // Культурология. – 2-е изд., перараб. и доп. – СПб. : Изд-во «Лань», 2003. – С. 730–915.

4. *Моль, А.* Социодинамика культуры : пер. с фр. /А. Моль ; вступ. ст., ред. и примеч. Б. В. Бирюкова, Р. Х. Зарипова, С. Н. Плотникова. – М. : Прогресс, 1973. – 405 с.

5. *Скараходаў, У. П.* Сацыядынаміка культуры сучаснай Беларусі / У. П. Скараходаў. – Мінск : Беларус. дзярж. ін-т праблем культуры, 2003. – 342 с.

6. *Смолік, А. І.* Дынаміка культуры / А. І. Смолік // Культуралогія : тэорыя культуры : вучэб. дапам. / А. І. Смолік, Л. К. Кухто. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – С. 207–243.

7. *Сорокин, П. А.* Социальная и культурная динамика / П. А. Сорокин ; пер. с англ., вступ. ст., коммент. В. В. Сапова. – М. : Астрель, 2006. – 1175 с.

8. *Тайлор,* Э. Первобытная культура : пер. с англ. / Э. Тайлор ; предисл. и примеч. А. И. Першица. – М. : Политиздат, 1989. – 572 с.

9. *Тойнби, А.* Постижение истории : сборник / А. Тойнби ; пер. с англ. Е. Д. Жаркова. – М. : Прогресс. Культура, 1996. – 607 с.

10. *Тоффлер,* Э. Третья волна : пер. с англ. / Э. Тоффлер ; науч. ред., авт. предисл. П. С. Гуревич. – М. ; Назрань : АСТ, 1999. – 781 с.

11. *Уайт, Л.* Энергия и эволюция культуры / Л. Уайт // Антология исследований культуры / сост. С. Я. Левит. – М., 1997. – Т. 1 : Интерпретации культуры / отв. ред. и сост. Л. А. Мостова. – С. 439–464.

12. *Шпенглер,* О. Закат Европы / О. Шпенглер ; пер. с нем. под ред. А. А. Франковского. – М. : Искусство, 1993. – 303 с.

13. *Штомпка, П.* Социология социальных изменений /П. Штомпка ; пер. с англ. под ред. В. А. Ядова. – М. : Аспект Пресс, 1996. – 415 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*

1. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага сьветагляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

2. *Аванесова, Г. А.* Динамика культуры / Г. А. Аванесова // Культурология. XX век : словарь. – СПб. : Университетская книга, 1997. – С. 99–102.

3. *Бабосов, Е. М.* Современный социум: характер и направленность развития / Е. М. Бабосов, Ч. С. Кирвель, О. А. Романов. – Минск : Четыре четверти, 2013. – 728 с.

4. *Багдасарьян, Н. Г.* Социокультурная динамика / Н. Г. Багдасарьян // Культурология : учебник для студ. техн. вузов / Н. Г. Багдасарьян, Г. В. Иванченко, А. В. Литвинцева [и др.]. – 4-е изд., испр. – М. : Высш. шк., 2002. – С. 76–97.

5. *Белл, Д.* Грядущее постиндустриальное общество: опыт социального прогнозирования / Д. Белл. – М. : Academia, 1999. – CLXX, 783 с.

6. *Ерасов, Б. С.* Социальная культурология : учебник / Б. С. Ерасов. – 3-е изд., доп. и перераб. – М. : Аспект Пресс, 2000. – 590 с.

7. *Кребер, А.* Конфигурация развития культуры / А. Кребер // Антология исследований культуры. Т. 1. – СПб. : Университетская книга, 1997. – С. 225–271.

8. *Крывашэй, Д. А.* Дзяржаўная культурная палітыка ў Беларусі, 1991–2010 гг. / Д. А. Крывашэй. – Мінск : Беларус. навука, 2014. – 519 с.

9. Культура Беларуси: 20 лет развития, 1991–2011 / С. П. Винокурова [и др.] ; под общ. ред. О. А. Галкина, И. Г. Голубевой. – Минск : Ин-т культуры Беларуси, 2012. – 329 с.

10. *Лотман, Ю. М.* Культура и взрыв / Ю. М. Лотман. – М. : Гнозис : Прогресс, 1992. – 271 с.

11. *Смолік, А. І.* Сацыядынаміка культуры у пасткатастрофным соцыуме / А. І. Смолік. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1999. – 245 с.

12. *Сорокин, П. А.* Человек. Цивилизация. Общество / П. А. Сорокин ; общ. ред., предисл. А. Ю. Согомонова. – М. : Политиздат, 1992. – 543 с.

13. *Степин, В. С.* Эпоха перемен и сценарии будущего : избр. соц.-филос. публицистика / В. С. Степин. – М. : Ин-т философии Рос. акад. наук, 1996. – 174 с.

14. *Стиглиц, Дж.* Глобализация: тревожные тенденции / Дж. Стиглиц. – М. : Мысль, 2003. – 300 с.

15. *Флиер, А. Я.* Культурогенез / А. Я. Флиер. – М. : Рос. ин-т культурологии, 1995. – 128 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*16. Хантингтон, С.* Столкновение цивилизаций : пер. с англ. / С. Хантингтон. – М. : АСТ ; СПб. : Terra fantastica, 2003. – 603 с.

*17. Эйзенштадт, Ш.* Революция и преобразование обществ: сравнительное изучение цивилизаций / Ш. Эйзенштадт ; пер. с англ. А. В. Гордона ; науч. ред. пер. Б. С. Ерасов. – М. : Аспект Пресс,1999. – 415 с.

*18. Ясперс, К.* Смысл и назначение истории / К. Ясперс ; пер. с нем., вступ. ст. П. П. Гайденко. – М. : Политиздат, 1991. – 527 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метады і тэхналогіі навучання

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
– праектныя тэхналогіі;
– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, прэс-канферэнцыі, вучэбныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады);
– метад аналізу канкрэтных сітуацый;
– гульнявыя тэхналогіі, у межах якіх студэнты ўдзельнічаюць у дзелавых, ролевых, імітацыйных гульнях, і інш.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання неабходнай сацыяльна-асобаснай і сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці магістрантаў ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Для вызначэння навучальных дасягненняў магістранта магчыма выкарыстоўваць крытэрыяльна-арыентаваныя тэсты. Яны ўяўляюць сабой сукупнасць тэставых заданняў закрытай формы з адным або некалькімі варыянтамі правільных адказаў; заданняў на ўстанаўленне адпаведнасці паміж элементамі двух варыянтаў з адным ці некалькімі суадносінамі і роўнай або рознай колькасцю элементаў і варыянтаў; заданняў адкрытай формы з фармалізаваным адказам; заданняў на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці.

Для вызначэння адпаведнасці вучэбных дасягненняў магістранта патрабаванням адукацыйнага стандарту таксама магчыма выкарыстоўваць праблемныя, творчыя заданні, якія прадугледжваюць эўрыстычную дзейнасць і нефармалізаваны адказ.

## Метадычныя рэкамендацыі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**па арганізацыі і выкананню самастойнай працы**

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны прымяняюцца наступныя формы самастойнай работы:

– праца магістрантаў з навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай, з першакрыніцамі, самастойнае вывучэнне асобных пытанняў вучэбнай дысцыпліны, падрыхтоўка да семінарскіх заняткаў і экзамену;

– кантралюемая самастойная праца ў выглядзе выканання індывідуальных заданняў, у тым ліку пісьмовых апытанняў з кансультацыямі выкладчыка;

– падрыхтоўка рэфератаў па індывідуальных тэмах і прадстаўленне дакладаў з прэзентацыямі на семінарскіх занятках.

Выкананая праца павінна адлюстроўваць ступень засваення магістрантам тэарэтычных пытанняў, уменне самастойна думаць, лагічна разважаць, ставіць пытанні, абагульняць, вызначаць праблемы, рабіць высновы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ